[1, с. 362]. Эти меры были вызваны окончанием войны, увеличившимся потоком возвращающихся военнопленных по сравнению с беженцами, необходимостью усиления пропагандистской работы.

На заседании губпленбежа 30 декабря 1918 года рассматривался вопрос о проведении Дня пленного в Витебской губернии 5 января 1919 года; в его программе – обеспечение прибывших в Витебск пленных одеждой, обедом, организация бесплатного спектакля и концерта, проведение других культурных мероприятий [1, с. 575, 580].

Таким образом, наиболее значимыми направлениями в деятельности Витебского губпленбежа в 1918 году являлись: взаимодействие с Центропленбежем и Копленбежем, организация работы контрольно-пропускных пунктов, регистрация пленных и беженцев, обустройство временного жилья для пленных и беженцев, обеспечение продовольствием и обмундированием, организация медицинского обслуживания, временное трудоустройство пленных и беженцев, организация работы информационно-справочного бюро, агитационно-пропагандистская деятельность, возвращение бывших пленных и беженцев в родные места.

Список использованных источников и литературы:

1. Государственный архив Витебской области (ГАВО). Ф.1821. Оп. 1. Д. 244.
2. ГАВО. Ф. 1821. Оп. 1. Д. 251.

## БРЭСЦКІ МІР 1918 ГОДА Ў ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАГА НАРОДА

С. А. Траццяк, старшы навуковы супрацоўнік;
Інстытут гісторыі НАН Беларусі

Прадстаўлены даклад мае мэтай раскрыць месца і ролю Брэсцкага міру ў гісторыі беларускага народа, і перш за ўсё яго ўплыў на развіццё працэсаў дзяржаўнага будаўніцтва і нацыянальна-дзяржаўнага самавызначэння Беларусі. Храналагічныя межы даклада ахопліваюць час з лістапада 1917 г. да канца студзеня 1919 г. – ад моманту пачатку перагавораў аб заключэнні «салдацкіх міроў» на Заходнім фронце да аб'яднання БССР з савецкай Літвой у адзіную Літоўска-Беларускую ССР. У гэты перыяд адбыліся складванне, дзеянне і распад Брэст-Літоўскай сістэмы міждзяржаўных адносін на Усходзе Еўропы, а таксама афармленне новай геапалітычнай рэальнасці як вынік пачатку польска-савецкага ваеннага канфлікту.

Аналіз дакументаў, матэрыялаў і даследванняў, што датычацца заключэння ў лістападзе 1917 г. прыватных перамір'яў («салдацкіх міроў») паміж супрацьстаячымі расійскімі і германскімі войскамі ў Беларусі, а таксама паміж

расійскім Заходнім фронтам і супрацьстаячай германскай групай армій генерала Эйхгорна, паказвае, што «салдацкія міры» мелі характар ваенна-тэхнічных, а не дзяржаўна-палітычных пагадненняў. Прадстаўнікі мясцовых цывільных органаў улады, насельніцтва Беларусі і бежанцаў-беларусаў да ўдзелу ў выпрацоўцы і падпісанні «салдацкіх міроў» не прыцягваліся, і пытанні будучага лёсу Беларусі ў гэтых дакументах не ўзнімаліся.

Мірныя перагаворы паміж Расіяй і краінамі Чацвярнога саюза (Германіяй, Аўстра-Венгрыяй, Асманскай Імперыяй і Балгарыяй) пачаліся 9 снежня 1917 г. у Брэст-Літоўску. Упартая лінія савецкага кіраўніцтва на зацягванне мірных перагавораў у чаканні пачатку пралетарскай рэвалюцыі ў Германіі і Аўстра-Венгрыі, неаднаразовыя спробы савецкага ўрада далучыць да ўдзелу ў мірнай канферэнцыі саюзнікаў Расіі па Антанце, а таксама нежаданне асобных з савецкіх кіраўнікоў своечасова прыняць мір на грабежніцкіх германскіх умовах прама прычыніліся да зрыву мірнай канферэнцыі. Германскі кайзераўскі ўрад атрымаў легальную падставу для ваеннага ўварвання ў савецкую Расію. Пры гэтым антысавецкая ваенная інтэрвенцыя краін Чацвярнога саюза ў Беларусі пачалася не 18 лютага 1918 г. (пераход у наступленне германскіх армій Усходняга фронта), а на два дні раней – 16 лютага 1918 г. – пераходам у наступленне часцей 1-га Польскага корпуса (войскі прагерманскага Польскага Каралеўства) на мінска-слуцкім напрамку.

Мір, які ставіў кропку на ўдзеле Расіі ў Першай сусветнай вайне, прыйшлося падпісаць 3 сакавіка 1918 г. на германскіх умовах, але куды цяжэйшых. Расія поўнасцю страчвала Прыбалтыку, Польшчу, частку Заходняй Беларусі з гарадамі Вільняй, Гродна, Брэстам і Беластокам, Карс, Ардаган і Батум. Украіна і Фінляндыя прызнаваліся самастойнымі дзяржавамі. Урад РСФСР абавязаўся заключыць мірны дагавор з Украінай і прызнаць яе дагавор з дзяржавамі Чацвярнога союза, у тым ліку і ў пытанні аб паўночна-заходняй мяжы Украіны, якая прайшла на поўнач ад Брэста, Кобрына і Драгічына. Армія і флот Расіі падлягалі дэмабілізацыі. Толькі пасля заканчэння дэмабілізацыі і заключэння ўсеагульнага міру Расіі вярталіся яе тэрыторыі на ўсход ад новай дзяржаўнай мяжы (у тым ліку тэрыторыя Цэнтральнай і Усходняй Беларусі) і ваеннапалонныя. Поўнасцю аднаўляліся ўмовы гандлёвага дагавору 1904 г. Уступленне немцаў на Украіну спрыяла перамозе контррэвалюцыі на Доне і Кубані, Паўночным Каўказе і ва ўсім Закаўказзі.

У выніку Брэсцкага міру РСФСР страціла 1 млн. км$^2$ тэрыторыі, 1/3 насельніцтва, 90 % каменнага вугалю, 73 % жалезнай руды, 54 % прамысловых магутнасцяў, 33 % чыгуначнай сеткі. Аднак з ваенна-палітычнага пункту гледжання, Брэсцкі мір забяспечыў Расіі ўзброены нейтралітэт і магчымасць мірнага жыцця ва ўмовах Першай сусветнай вайны. Германія, яе саюзнікі і сатэліты прызналі легітымнасць савецкага ўрада і поўную самастойнасць РСФСР ва ўнутранай і знешняй палітыцы. Брэсцкі мір стварыў перадумовы для ўмацавання савецкай улады і далейшага развіцця бальшавіцкай рэвалюцыі, павышэння абароназдольнасці краіны і падрыхтоўкі, па выразе Леніна, да

«сапраўды рэвалюцыйнай вайны». Менавіта таму грабежніцкі мір, які фіксаваў паражэнне Расіі і яе фактычнае выдаленне з Еўропы, трэба ацэньваць як поспех савецкай рэспублікі, здабыты за вельмі высокі кошт.

Брэсцкі мір дазволіў савецкай уладзе захавацца на ўсходняй частцы тэрыторыі Беларусі і працягваць там распачатую Кастрычніцкай рэвалюцыяй палітыку радыкальных сацыяльных і палітычных пераўтварэнняў. Час Брэсцкага міру бальшавікі скарысталі для перабудовы бессістэмнай кашы савецкіх органаў у паўнавартасную дзяржаўную машыну. Выкліканы агульным эканамічным і сацыяльным крахам Расійскай дзяржавы вясною 1918 г. пераход да надзвычайнай палітыкі ваеннага камунізму меў дваістыя наступствы. Аднаўленне натуральнай подаці (у форме харчраскладкі ці харчовага падатку) і рэкрутчва і няўхільнае правядзенне ў жыццё палітыкі чырвонага тэрору ў дзяржаўна-прававым парадку пасварылі рэвалюцыйны ўрад з шырокімі масамі сялянства і гарадскімі сярэднімі пластамі. У выніку ўлетку 1918 г. распалася ўрадавая кааліцыя бальшавікоў і левых эсэраў, а ўвосень усходнія губерні Беларусі ўпершыню ахапіла хваля паўстанняў т. зв. «зялёных». Разам з тым, мерапрыемствы савецкай улады пераканалі народныя масы ў тым, што менавіта бальшавікі ёсць адзіны рэальны прэтэндэнт на ўладу ў дзяржаве. З другога боку, акупацыя заходняй і цэнтральнай частак Беларусі германскімі войскамі стварыла там спецыфічныя ўмовы для развіцця беларускага нацыянальна-палітычнага руху. Таксама факт акупацыі войскамі кайзераўскай Германіі часткі беларускіх зямель і нyздольнасці Расіі абараніць іх адбіўся на развіцці працэсаў нацыянальна-дзяржаўнага самавызначэння Беларусі, прыспешыўшы абвяшчэнне беларускімі нацыянал-дэмакратамі незалежнасці Беларускай Народнай Рэспублікі.

Галоўным для беларускага народу у той час было выйсці з паласы спусташальнай вайны, захаваць сваё жыццё і дабрабыт. У падмурку дзеянняў беларускіх нацыянальна-палітычных сіл розных лагераў у канцы 1917 г. ляжала памкненне не дапусціць падзелу Беларусі паміж Германіяй і Расіяй і ўжыць усе сілы і захады, каб у пасляваенным свеце край уяўляў сабою адзіны цэлакупны дзяржаўны арганізм. Лідэр мясцовых бальшавікоў А. Мяснікоў і яго паплечнікі па Аблвыканкомзаху свядома не выносілі беларускае пытанне на разгляд СНК Расійскай Рэспублікі і мірнай канферэнцыі ў Брэсце. Кіраўніцтва вобласці і фронту лічыла неабходным прыняць германскі ультыматум. На яго пазіцыю паўплываў, несумненна, той факт, што ў любым выпадку новая савецка-германская дзяржаўная граніца прайшла б на захад ад лініі расійска-германскага фронту, якая склалася на канец 1917 – пачатак 1918 г.

У пачатку снежня 1917 г. СНК Расійскай Рэспублікі выказаў пэўную зацікаўленасць у стварэнні аўтаномнай Беларускай вобласці савецкай Расіі. Такі крок дазволіў бы перавесці на практычныя рэйкі пытанне вяртання Расіі акупаваных Германіяй раёнаў Заходняй Беларусі і Літвы на падставе нацыянальнага самавызначэння. Але Краявы Усебеларускі з’езд Саветаў так і не адбыўся. Аблвыканкомзах і СНК Зах ухіліліся ад выканання ўмоў

заключанага без іх удзелу і за іх спінамі пагаднення паміж Наркамнацам і Беларускім Абласным Камітэтам сялянскіх дэпутатаў. Белабластком жа з самага пачатку стаяў на пазіцыях непрызнання ўжо існуючай у краі савецкай улады. Скліканы ім і Вялікай Беларускай Радай у снежні 1917 г. 1-ы Усебеларускі з'езд быў разагнаны войскамі Мінскага гарнізона па загадзе СНК Зах. Агульнае абвастрэнне становішча ў Заходняй вобласці і фронце ў сувязі з антысавецкім мяцяжом 1-га Польскага корпуса, а таксама адсутнасць нацыянальных партыйных і савецкіх кадраў у краі і непрыняцце народам і грамадскасцю Усходняй Беларусі ідэі адрыву беларускіх земляў ад Расіі зрабілі пытанне нацыянальна-дзяржаўнага самавызначэння савецкай Беларусі для цэнтральнага савецкага ўрада заўчасным.

У сваю чаргу, германскі ўрад і германскае ваеннае камандаванне, рыхтуючы ваенную інтэрвенцыю ў савецкую Расію, былі зацікаўлены ў атрыманні т. зв. «закліка аб дапамозе» ад праціўнікаў бальшавікоў як легальнай падставе для ўварвання. Аднак скарыстаць факт разгону 1-га Усебеларускага з'езду як падставу для ўмяшання пад сцягам абароны права нацый на самавызначэнне германскі бок не здолеў. Немалую ролю ў гэтым адыграла відавочная розніца ў падыходах і патрабаваннях беларускіх нацыянальных цэнтраў у Мінску і Вільні. Калі першы выказваўся за нацыянальна-дзяржаўную аўтаномію Беларусі ў складзе федэратыўнай дэмакратычнай Расіі, то другі выступаў (ад імя свайго і мінчан) за аднаўленне незалежнасці Вялікага княства Літоўскага ў «гістарычных» межах. Таму беларускае пытанне не стала прадметам разгляду на Брэст-Літоўскай мірнай канферэнцыі, і мір, які самым непасрэдным чынам датычыўся Беларусі, быў заключаны без удзелу прадстаўнікоў беларускіх земляў і без уліку інтарэсаў Беларусі.

У час паміж заключэннем Брэсцкага міру і падпісаннем Берлінскага дадатковага дагавора (3 сакавіка і 27 жніўня 1918 г.), калі пад германскай акупацыяй апынулася 85 % тэрыторыі Беларусі, акупанты выказалі намер далучыць частку Віцебскай губерні да Германскай Імперыі ў якасці Вялікага герцагства Полацкага, цэнтральную ж частку Беларусі з гарадамі Мінскам, Бабруйскам і Магілёвам перадаць Польскаму Каралеўству ў якасці кампенсацыі за страчаныя на карысць Германіі землі на захад ад Віслы. Германскае палітычнае і ваеннае кіраўніцтва планавала пасля перамогі на Захадзе ўзнавіць увосень 1918 года баявыя дзеянні супраць Расіі, сілаю зброі ліквідаваць бальшавіцкі рэжым і стварыць на землях на ўсход ад Дняпра буфернае Вялікае герцагства Смаленскае. Месца Беларусі ў гэтых планах не знаходзілася.

Немцы ў народнай свядомасці фігуравалі як чужакі і прыгнятальнікі, што знайшлі апору ў маёмасных пластах насельніцтва. Але структуры дапаможнай адміністрацыі, створаныя акупантамі, успрымаліся ў народзе як больш непасрэдны праціўнік, чым самі акупанты. Справа, на наш погляд, у тым, што германскія акупанты у большасці занятых імі раёнаў знаходзіліся часова – да заключэння ўсеагульнага міру. На акупіраваных тэрыторыях на ўсход ад вызначанай у Брэсце савецка-германскай граніцы працягвалі функцыянаваць

расійскія ўрадавыя ўстановы, якія фінансаваліся савецкім урадам. На гэтыя тэрыторыі раней ці пазней павінны былі вярнуцца савецкія войскі і савецкая адміністрацыя, і яны сапраўды пачалі вяртацца ў верасні 1918 г. Германскі акупацыйны рэжым, да таго ж, розніўся і ў лепшы бок ад савецкай рэчаіснасці 1918 года. Акупанты не ставілі сабе за мэту радыкальную ломку і перабудову ўсіх бакоў грамадскага жыцця на новых, ніколі не існаваўшых дагэтуль пачатках. У акупіраваных раёнах не было голаду і эпідэмій, грамадска-палітычная абстаноўка тут была больш спакойная, чым у савецкай краіне. У выніку, нягледзячы на значны размах, антыгерманская партызанская і паўстанцкая барацьба ў акупаванай Германіяй частцы Беларусі не набыла характару ўсенароднай партызанскай вайны, і ў гэтым відавочная розніца паміж 1918 г. і 1941 – 1944 гг.

Тым не менш, да лета 1918 г. практычна ўсе працоўныя пласты насельніцтва Беларусі паядналі адмоўныя адносіны да акупантаў, якія пераносіліся і на тых мясцовых дзеячоў, што па ўласнай ініцыятыве і з уласных разлікаў пайшлі на супрацоўніцтва з імі. 1-я канферэнцыя камуністычных арганізацый акупаваных тэрыторый Літвы і Беларусі, што праходзіла ў Смаленску 8 – 11 жніўня 1918 г., абрала для патрэб практычнага кіраўніцтва Краявы камітэт камуністычных арганізацый Беларусі і Літвы, якому падпарадкоўваліся бальшавіцкія арганізацыі Мінскага, Палескага, Магілёўскага і Бабруйскага партыйных раёнаў. Новаўтвораная Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі і Літвы ўвайшла у склад Паўночна-Заходняй арганізацыі РКП(б). Бальшавікі раёнаў акупацыі імкнуліся падкрэсліць нацыянальную спецыфіку свайго краю, але адначасова адмаўлялі нацыянальна-вызваленчы кампанент барацьбы беларускага народа з акупантамі і іх памагатымі. У запале барацьбы з нацыянальнымі дзеячамі камуністы-падпольшчыкі схільныя былі трактаваць нацыянальныя праявы як падкоп пад інтэрнацыяналізм і пралетарскую рэвалюцыю ў Еўропе.

У сваю чаргу партыйнае і савецкае кіраўніцтва Заходняй вобласці стаяла, па сутнасці, на пазіцыях заходнерусізму ў рэвалюцыйнай афарбоўцы. У час дзеяння Брэсцкага міру цэнтральныя савецкія структуры ішлі насустрач Аблвыканкомзаху, бо лічылі неабходным мець на заходніх граніцах савецкай Рэспублікі такі ж надзейны палітычны, ваенны і эканамічны фарпост, як Туркестанская Савецкая Рэспубліка і Бакінская Камуна ў Азіі. У падмурак гэтых савецкіх аўтаномій быў пакладзены тэрытарыяльны прынцып. Агульным было перакананне, што, ва ўмовах ваеннай інтэрвенцыі дзяржаў Чацвярнога саюза і Антанты ў Расію, нацыянальна-дзяржаўнае самавызначэнне савецкіх тэрыторый у рэшце рэшт пойдзе на карысць толькі ворагам РСФСР.

У адпаведнасці з Брэсцкім мірным трактатам Германія не брала на сябе абавязку паважаць тэрытарыяльную цэласнасць і існуючыя дзяржаўныя межы Расіі, а савецка-германская дэмаркацыйная лінія падлягала пазнейшаму ўдакладненню. 25 сакавіка 1918 г. Рада БНР з удзелам прадстаўнікоў Беларускай рады Віленшчыны прыняла 3-ю Устаўную грамату да народаў

Беларусі, у якой абвясціла поўную дзяржаўную незалежнасць БНР у межах Магілёўскай, Мінскай, беларускіх частак Віцебскай, Віленскай, Гродзенскай, Смаленскай, Чарнігаўскай і суседніх губерняў. «На моцы гэтага, – зазначалася ў 3-й Устаўнай грамаце, – ўрад Беларускае Народнае Рэспублікі мае ўвайсці ў зносіны з зацікаўленымі старанамі, прапануючы ім перагледзець тую часціну Берасцейскага трактату, якая датычыць Беларусі, і падпісаць мірную ўмову з усімі ваяваўшымі дзяржавамі».

Абвяшчаючы 25 сакавіка 1918 г. незалежнасць Беларускай Народнай Рэспублікі, дзеячы БНР апелявалі да народнага пачуцця, абражанага Брэсцкім мірам. Ім здавалася, што відавочная ў лютым – сакавіку 1918 г. няздольнасць савецкай Расіі абараніць Беларусь адсунула Маскву, як цэнтр палітычнай арыентацыі беларусаў, у гістарычную мінуласць. З другога боку, прысутнасць у Беларусі германскіх акупацыйных войск і акупацыйнай адміністрацыі бачылася ім гарантыяй незалежнасці БНР ад Расіі і Польшчы і незваротнасці еўрапейскага цывілізацыйнага выбару, зробленага Беларускай Радай.

Палітыкай пакорлівага супрацоўніцтва з акупантамі Рада БНР дарэмна разлічвала дабіцца юрыдычнага прызнання з боку Германіі. Немцы Беларускай Радзе перашкод не чынілі, але ўвесь час яскрава давалі зразумець, што максімум, на які яна можа разлічваць – гэта роля органа нацыянальнага прадстаўніцтва пры акупацыйнай адміністрацыі і «інкубатара» кадраў для будучых рэзервовых мясцовых урадаў. Бундаўска-эсэраўскія земствы і мясцовыя самакіраванні абвінавацілі Раду БНР у здрадзе Радзіме і рэвалюцыі. Народныя масы і ўлады Заходняй вобласці РСФСР проста ігнаравалі Беларускую Раду. Савецкі ўрад у Маскве пагаджаўся на ўдзел беларускіх сацыял-дэмакратаў у будучым савецкім урадзе Беларусі, але катэгарычна не жадаў прызнаваць БНР дэ-юрэ і дэ-факта. Адзіная дзяржава, якая ў 1918 г. дэ-факта прызнала БНР – Украіна, не пайшла на прызнанне БНР дэ-юрэ, паколькі разлічвала паправіць сваё становішча паміж Масквой і Берлінам за кошт Беларусі.

У перагаворах вакол савецка-германскага дадатковага дагавора германскія, украінскія і савецкія дыпламаты выкарыстоўвалі дыпламатычную актыўнасць Рады БНР, яе барацьбу за сваё дыпламатычнае прызнанне з боку РСФСР, і палітычныя пазіцыі пэўных груп беларускага грамадства ў якасці дапаможнага інструменту ціску на савецкую Расію ў пытанні аб праходжанні савецка-германскай дэмаркацыйнай лініі і дзяржаўных граніц РСФСР і Украіны. На працягу вясны – лета 1918 г. па савецкай частцы Усходняй Беларусі прайшла хваля пратэстаў супраць тэрытарыяльных дамаганняў Германіі, Украіны і Беларускай Рады, арганізаваная Белнацкамам. Пратэстная хваля ахапіла таксама масу беларусаў (бежанцаў і вайскоўцаў) у савецкай Расіі, перакінулася на раёны часовай акупацыі. У выніку пратэстнай кампаніі пытанні аб дакладным праходжанні дэмаркацыйнай лініі і аб унутраным становішчы раёнаў часовай акупацыі, як маючыя не тэхнічнае, а прынцыповае значэнне,

былі перанесены ў маі 1918 г. на разгляд савецка-германскай палітычнай камісіі па выпрацоўцы ўмоў дадатковага дагавору.

У паняцце дадатковага дагавору Германія і савецкая Расія ўкладвалі розны змест. Германія ўпарта імкнулася да палітычнага і эканамічнага закабалення Расіі, тады як савецкія дыпламаты настойліва дамагаліся таго, каб Дадатковы дагавор базіраваўся на раўнапраўі і роўнай выгодзе бакоў. Падпісаны 27 жніўня 1918 г. у Берліне Дадатковы руска-германскі дагавор меў выразна кампрамісны характар. Шэраг палажэнняў быў для РСФСР цяжкім (у першую чаргу выплата вялікай кантрыбуцыі). Але іншыя артыкулы давалі відавочныя выгоды. Спыняўся рух германскіх войск на ўсход, а лінія дэмаркацыі і дзяржаўнай граніцы падлягала дакладнаму вызначэнню. Германія абавязвалася не ўмешвацца ў адносіны РСФСР з асобнымі абласцямі былой Расійскай імперыі, ні выклікаць, ні падтрымваць утварэння самастойных дзяржаўных арганізмаў у гэтых абласцях і не садзейнічаць адарванню ад Расіі новых тэрыторый. Акупаваныя Германіяй землі РСФСР падлягалі ачышчэнню ад акупацыйных войск яшчэ да заключэння ўсеагульнага міру. Ужо ў сярэдзіне верасня 1918 г. германскія войскі пачалі эвакуацыю з цэнтральнай Беларусі. Да 28 лютага 1919 г. апошні германскі салдат павінен быў адысці за расійска-германскую дзяржаўную граніцу, вызначаную Брэсцкім мірам.

Дагавор ад 27 жніўня 1918 г. падмацаваў у германскіх правячых колах тэндэнцыю супрацоўнічаць з бальшавікамі, пакуль яны яшчэ ва ўладзе, бо толькі бальшавіцкі ўрад быў гарантам атрымання кантрыбуцыі з Расіі, аднак ён жа выклікаў і рэзкія супярэчнасці паміж Германіяй, яе саюзнікамі і сатэлітамі. Пачатак адыходу германскіх акупантаў у верасні 1918 г., які быў непасрэдным вынікам Берлінскага дадатковага савецка-германскага дагавору, выклікаў ажыўленне ў грамадска-палітычным жыцці і адразу змяніў суадносіны сіл у часова акупаваных раёнах Беларусі на карысць бальшавікоў.

Лістападаўская 1918 года рэвалюцыя ў Германіі паклала канец існаванню Брэст-Літоўскай сістэмы міждзяржаўных адносін на Усходзе Еўропы. 13 лістапада 1918 г. УЦВК урачыста ануляваў Брэсцкі мірны і Берлінскі дадатковы дагаворы з Германіяй. У выніку перамогі буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі 9 лістапада 1918 г. Германія была абвешчана дэмакратычнай рэспублікай, але новы Берлінскі ўрад праяўляў варожасць у дачыненні РСФСР і імкнуўся да ўдзелу ў антысавецкай вайне, якую вяла Антанта. Аднак працэс разлажэння германскага Усходняга фронта набыў незваротны характар. 16 лістапада 1918 г. германскае камандаванне было вымушана аддаць загад аб эвакуацыі сваіх войск з Расіі. Германскія салдаты актыўна супраціўляліся ўсялякай спробе зацягнуць эвакуацыю, сутыкаючыся штодня з выразна прасавецкімі настроямі і дзеяннямі мясцовага насельніцтва. У некаторых выпадках рэвалюцыйна настроеныя германскія салдаты самі прымалі актыўны ўдзел у аднаўленні савецкай улады ў краі.

Лістападаўская рэвалюцыя ў Германіі і скасаванне 13 лістапада 1918 г. Брэсцкага мірнага і Руска-германскага дадатковага (Берлінскага) дагавораў

разбурылі таксама і той прасценак, які яшчэ існаваў паміж раёнамі германскай акупацыі і савецкай Расіяй. Бальшавікі і мясцовыя антыбальшавіцкія палітычныя цэнтры апынуліся сам-насам. Насельніцтва занятых германскімі акупантамі раёнаў звязвала з прыходам савецкіх войск надзеі на радыкальныя пераўтварэнні ў інтарэсах працоўных мас – найперш на радыкальную зямельную рэформу, і на магчымасць звесці рахункі з непасрэднымі ворагамі. Таму падчас паходу Асобнай Заходняй арміі ў Беларусь (лістапад 1918 г. – люты 1919 г.) выразна прасавецкія настроі і дзеянні сельскага і гарадскога насельніцтва перадумовілі палітычную і маральную ізаляванасць антыбальшавіцкіх сіл у Беларусі, прадухілілі развіццё падзей у краі па шляху грамадзянскай вайны паміж бальшавікамі і іх мясцовымі арганізаванымі праціўнікамі.

Ва ўмовах крушэння Брэст-Літоўскай міжнароднай сістэмы і складвання новай геапалітычнай рэальнасці на Усходзе Еўропы ў раёнах, дзе існавалі прагерманскія ўрады, якія пасля паражэння Германіі перакінуліся на бок Антанты і былі ў той ці іншай ступені прызнаныя ёю, быў абраны курс на арганізацыю савецкіх рэспублік, звязаных з РСФСР адносінамі ідэалагічнага адзінства, палітычнага, эканамічнага і ваеннага саюза. У адрозненне ад рэспублік Прыбалтыкі і Украіны, унутраныя перадумовы для абвяшчэння незалежнай Беларускай Савецкай Рэспублікі былі меншымі. Абставіны існавання савецкай улады ў краі і жыцця беларускага народу ва ўмовах Брэст-Літоўскай сістэмы не спрыялі іх складванню. Палітычна актыўным пластам і групам насельніцтва краю была відавочная няздольнасць Беларусі абараніць сваю самастойнасць і грамадскі лад толькі ўласнымі сіламі. Таму незалежніцкія настроі ў беларускім грамадстве традыцыйна былі слабыя.

Канфесійны і культурны раскол беларускага этнасу толькі абвастрыўся ва ўмовах Брэсцкага міру. У разуменні носьбітаў ідэалогіі беларускіх незалежных сіл – пераважна каталіцкай часткі нацыянальнай разначынна-сялянскай інтэлігенцыі і нацыянальнай аграрнай буржуазіі, германская ваенная інтэрвенцыя і Брэсцкі мір аб’ектыўна азначалі вызваленне Беларусі з-пад ярма «азіяцкай дэспатычнай Расіі» і «расійскага бязладу» і «вяртанне» Беларусі ў лона еўрапейскай цывілізацыі. Спецыфічныя ўмовы германскай акупацыі яны разлічвалі скарыстаць для адбудовы незалежнай беларускай дзяржавы. Аднак ініцыятыва беларускіх нацыянал-дэмакратаў, якія 25 сакавіка 1918 г. абвясцілі незалежнасць Беларускай Народнай Рэспублікі, і тым самым узялі на сябе адказнасць за будучы лёс Беларусі і беларускай ідэі, не знайшла падтрымкі і паразумення ў большасці насельніцтва краіны. Праваслаўная і яўрэйская грамадскасць, абураючыся Брэсцкім мірам, бачыла Беларусь будучай часткай федэратыўнай дэмакратычнай Расіі. Значная частка дзяржаўных служачых устаноў старога рэжыму ў зоне часовай акупацыі захоўвала вернасць СНК РСФСР як адзінаму легітымнаму ўраду Расіі. У вачах службоўцаў старога рэжыму абвяшчэнне незалежнасці БНР супярэчыла міжнародна-прававым нормам і рэаліям, зафіксаваным у Брэст-Літоўскім мірным дагаворы.

Беларускія землі на ўсход ад новай дзяржаўнай граніцы, вызначанай у Брэсце, сваёй дзяржаўнай прыналежнасці юрыдычна не змянілі – гэта была тэрыторыя Расіі, толькі часова акупаваная Германіяй.

Што ж датычыцца беларускага сялянства, то 1-ы Усебеларускі з'езд і распрацаваная на ім «Пастанова аб краявой уладзе» яскрава паказалі, што беларуская сялянская маса пры вызначэнні будучага нацыянальна-дзяржаўнага статусу краю у тых геапалітычных умовах прыме толькі шырокую аўтаномію Беларусі ў складзе Расіі. Поўнае дзяржаўнае аддзяленне Беларусі ад Расіі, былі перакананы сялянскія дэлегаты, зробіць край лёгкай здабычай хцівых суседзяў – найперш палякаў. Па-другое, сяляне жадалі, каб новастворaная аўтаномная краявая ўлада Беларусі на справе праводзіла палітыку шырокіх агульнадэмакратычных пераўтварэнняў, абвешчаную СНК Расійскай Рэспублікі ў першыя дні савецкай улады. Прэс германскай акупацыі асабліва бязлітасна душыў беларускую вёску, з якой выкачвалі харчаванне і сыравіну. Таму абвяшчэнне незалежнасці акупаванай германскімі войскамі часткі Беларусі ад Расіі і выказаная Беларускай Радай гатоўнасць далучыць да гэтай, як тады казалі, «германскай» Беларусі і яе савецкую частку не магла не ўспрымацца як ігнараванне адраджэнцамі волі беларускага сялянства – волі, якую ў снежні 1917 г. яны ўрачыста абяцалі паважаць.

Ідэя аўтаномнай савецкай Беларусі ў складзе РСФСР, прапагандуемая Белнацкамам, карысталася вядомай папулярнасцю ў асяроддзі беларусаў-бежанцаў у Расіі і беларускай народнай інтэлігенцыі, але была па шэрагу прычын чужая асноўнай масе насельніцтва края і яго партыйным і савецкім кіраўнікам. Максімум, на што гатовыя былі пайсці мясцовыя бальшавікі у справе нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва ў Беларусі – гэта выступіць з прапановай стварэння Беларускай і Літоўскай Працоўнай Камуны ў складзе РСФСР. Рабоча-сялянскія масы ў сваёй большасці не жадалі для Беларусі іншай долі, акрамя федэратыўнага саюза з савецкай Расіяй. Іх нацыянальная самасвядомасць праходзіла толькі этап афармлення. Патрэбен быў час, каб яны ўсвядомілі сябе народам Беларусі, а не часткаю шматнацыянальнага народа Расіі.

У такіх абставінах ідэя дзяржаўнай незалежнасці Беларусі з апорай на Германію і ў саюзе з ёй, якую прапагандавалі ў перыяд Брэсцкага міру дзеячы БНР, карысці беларускай справе прынесці не магла і не прынесла. Наступныя кардынальныя змены ў савецкім нацыянальна-дзяржаўным будаўніцтве ў Беларусі, якія адбыліся на працягу лістапада 1918 – лютага 1919 г., вынікалі не столькі з грамадска-палітычнай сітуацыі ў краі і яўна выказанай волі працоўнага насельніцтва і дзяржаўна-палітычнага кіраўніцтва Беларусі, сколькі абумоўліваліся пазіцыяй савецкага кіраўніцтва ў Маскве і бягучымі суадносінамі сіл на Заходнім стратэгічным напрамку.

Менавіта развіццё падзей у Польшчы ў непажаданым для савецкай Расіі накірунку і варожасць падтрыманага Антантай буржуазнага польскага ўрада да РСФСР, прадвызначылі як імклівасць стварэння незалежнай бyфернай

Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусі, так і імкненне Масквы трымаць апошнюю пад шчыльным ідэолага-палітычным кантролем, а праз месяц да зліцця ССРБ і Савецкай Рэспублікі Літвы ва унітарную ССР Літвы і Беларусі (Літбел).

Такім чынам, беларускі фактар адыграў другарадную ролю ў перыяд выпрацоўкі, дзеяння і скасавання Брэст-Літоўскай сістэмы міжнародных адносін на Усходзе Еўропы. Аднак сітуацыя, створаная Брэсцкім мірам і германскай ваеннай інтэрвенцыяй, істотна паўплывала на ход і змест грамадска-палітычных працэсаў у краі.

## ВОЙНА КАК СОЦИАЛЬНОЕ ЯВЛЕНИЕ

А. В. Исаченко старший преподаватель;
Витебский государственный технологический университет

Термин «война» многогранен. Но, в общем, это понятие можно определить как конфликт интересов между различными странами, политическими группировками и иными подобными образованиями. Ее целью является получение различных благ: территории, политического господства, защита интересов и пр.

Война – это социальное явление. Она порождена человеческим обществом и существует с давних времен. Война эволюционирует вместе с развитием общества, приобретая новые формы, более совершенные средства и другие масштабы. В этом и содержится значимость этой проблемы.

Так или иначе, в ней находят отражение почти все стороны общественной жизни. Общество, особенно в крупных войнах, вынуждено мобилизовать весь свой потенциал – экономический, оборонительный, социальный, человеческий и т. д.

К причинам, порождающим военные конфликты XX века, прежде всего можно отнести изменения в сознании людей и их психологии.

Технологический прогресс, индустриальное развитие западноевропейских стран, с одной стороны, способствовали развитию рыночных отношений, что позволяло большему количеству населения получать те или иные материальные блага. С другой стороны, эти изменения в обществе привели к обезличиванию человека. Индивидуальное сознание превращалось в коллективное.

Личностные интересы, ценности постепенно вытеснялись массовыми интересами и ценностями. Массой легче управлять, она легче поддается воздействию и принимает навязываемую ей точку зрения. Вместо исторически сложившейся системы ценностей пришли корпоративные, тоталитарные ценности. За счет этих изменений изменялась и роль государства.